ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі універсітэт



№ 5(979) | АЎТОРАК, 28 сакавіка 2000 г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная

## ВУЧАНЬ ДАСТОЙНЫ НАСТАЎНІКА

З 11 сакавіка 2000г. загадам па Міністэрству адукацыі Рэспублікі Беларусь рэктарам Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны назначаны прафесар, доктар фізіка-матэматычных навук, член-карэспандэнт Акадэміі адукацыі рэспублікі, заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь Міхаіл Васільевіч Селькін.

Ён змяніў на гэтай пасадзе члена-карэспандэнта НАН Беларусі, доктара фізіка-матэматычных навук, прафесара Л.А.Шаматкова, побач з якім на працягу многіх гадоў працаваў ва універсітэце, быў яго вучнем не толькі ў навуцы, але і ў адносінах да работы, людзей, жыцця.

Яшчэ да заканчэння тэрміна знаходжання на пасадзе рэктара Л.А.Шамяткоў прыняў рашэнне займацца ў далейшым толькі выкладчыцкай і навуковай дзейнасцю: застацца працаваць ва універсітэце на пасадзе прафесара кафедры алгебры і геаметрыі М.В.Селькіна, кандыдатура якога на высокую пасаду была адобрана і зацверджана Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь А.Р.Лукашэнкам, з якім М.В.Селькін меў сустрэчу і гутарку.

Чалавек з вялікім інтэлектуальным багажом, вядомы ва ўсім свеце вучоны-матэматык, аддадзены справе развіцця адукацыі і навукі, Л.А.Шамяткоў заслужыў самых шчырых слоў удзячнасці і прызнання. Іх выказалі яму ў час сустрэчы міністр В.І.Стражаў, старшыня аблвыканкама М.Р.Вайцянкоў, прафесар, доктар філалагічных навук У.В.Анічэнка, старшыні прафкомаў Г.І.Варатніцкі і Н.І.Колтышава. У сваіх выступленнях яны яшчэ раз падкрэслілі тую вялікую ролю, якую Л.А.Шамяткоў, як прадаўжальнік традыцый, закладзеных былым рэктарам ГДУ Б.В.Бокуцем, адыграў у станаўленні ГДУ як вядучай вышэйшай навучальнай установы



На здымку: старшыня аблвыканкама М.Р.Вайцянкоў **уручыў Л.А.Шамяткову памятны падарунак — карціну.**
**Фота У.ЧЫСЦІКА.**

Афіцыйнае прадстаўленне шматтысячнаму калектыву ГДУ новага рэктара адбылося 11 сакавіка ў актавай зале ГДУ. На яго ў Гомель прыехаў міністр адукацыі В.І.Стражаў. Ён абвясціў аб падпісанні ім загада аб прызначэнні рэктарам Гомельшчыны, асабліва ў гады чарнобыльскай аварыі, калі адбываўся адток з поўдня Беларусі кваліфікаваных педагагічных кадраў. Нягледзячы на ўсе цяжкасці наш універсітэт захаваў свой аўтарытэт, цвёрда стаяў на пазіцыях дзяржаўнасці.

За шматгадовую добрасумленную працу ў сістэме адукацыі, плённую работу па падрыхтоўцы маладых спецыялістаў і вялікі асабісты ўклад у развіццё навукі Л.А.Шамяткоў узнагароджаны Ганаровымі граматамі Міністэрства адукацыі, аблвыканкама, якія яму ўручылі В.І.Стражаў і М.Р.Вайцянкоў. Атрымаў ён і падарункі на памяць — карціны.

Выступленне на сходзе Л.А.Шамяткова было своеасаблівай справаздачай аб тым, што зроблена за гады яго знаходжання на пасадзе рэктара: уведзены ў строй новы корпус фізічнага факультэта, адкрыты шэраг новых спецыяльнасцей і спецыялізацый, створаны саветы па абароне кандыдацкіх і доктарскіх дысертацый, пачаў падрыхтоўку спецыялістаў Франка-Беларускі інстытут кіравання, значна пашырыліся міжнародныя сувязі ГДУ з Германіяй, Францыяй, Італіяй, Кітаем. З дапамогай праграмы "Тэмпус" умацавана матэрыяльная база універсітэта — набыта сучасная вылічальная тэхніка, вядзецца будаўніцтва вучэбна-спартыўнага корпуса, пачаў выдавацца часопіс "Известия Гомельского государственного университета им.Ф.Скорины" і інш. Леанід Аляксандравіч пажадаў усяму калектыву універсітэта на чале з новым рэктарам працаваць дружна, захоўваць і памнажаць добрыя традыцыі ГДУ.

Глыбока сімвалічна, што новы рэктар М.В.Селькін заступіў на высокую пасаду таксама ва ўзросце 52 гадоў, як і яго настаўнік Л.А.Шамяткоў. У жыцці чалавека гэта час, калі ёсць мудрасць, вопыт, інтэлект, якія вельмі неабходны ў выкананні пастаўленых адказных мэтаў і задач. М.В.Селькін у сваім выступленні акрэсліў асноўныя прыярытэты ГДУ на бліжэйшыя гады, падзякаваў калектыву за аказаны яму высокі давер і выказаў спадзяванне на яго разуменне і падтрымку ў далейшай сумеснай рабоце.

**Т.ДУБЯК.**

## СЕЛЬКІН Міхаіл Васільевіч



Нарадзіўся ў 1947г. у г.Ветка Гомельскай вобласці.

У 1969г. скончыў матэматычны факультэт Гомельскага дзяржаўнага універсітэта з адзнакай, а ў 1973г. — аспірантуру ГДУ. Пэўны час выкладаў матэматыку і фізіку ў сельскай школе.

З 1973г. працуе ў нашым універсітэце старшым выкладчыкам кафедры алгебры і геаметрыі, з 1978г. — дацэнтам, а з 1991г. — прафесарам кафедры алгебры і геаметрыі (па сумяшчальніцтву), з 1979г. — намеснікам дэкана матэматычнага факультэта, з 1987г. — дэканам матфака, са студзеня 1990г. — першым прарэктарам, прарэктарам па вучэбнай рабоце. Дысертацыю на атрыманне вучонай ступені кандыдата фізіка-матэматычных навук абараніў у 1977 годзе, доктара фізіка-матэматычных навук — у 1998 г., вучонае званне дацэнта было прысвоена ў 1981г., прафесара — у 1991г.

Пры актыўным удзеле М.В.Селькіна ва універсітэце адкрыты новыя спецыяльнасці і спецыялізацыі, устаноўлены цесныя навукова-вучэбныя міжнародныя сувязі з Кітаем, Францыяй, Германіяй, Англіяй. Ён з'яўляецца членам Савета рэктараў Гомельскай вобласці, намеснікам старшыні Савета універсітэта, старшынёй навукова-метадычнага савета ГДУ.

М.В.Селькін актыўна працуе ў адной з інтэнсіўна развіваючыхся галін сучаснай алгебры — тэорыі фармацый. Пачынаючы з 1975г., прымаў удзел у рабоце ўсіх усесаюзных і беларускіх сімпозіумаў, канферэнцый і калёквіумаў па алгебры, выступаў з дакладамі на канферэнцыі матэматыкаў у ГДР у 1981 годзе і міжнародным матэматычным кангрэсе ў Японіі ў 1990г. У 1981 і 1993гг. знаходзіўся на стажыроўцы ў Германіі, прымаў удзел у нарадах па пытаннях вышэйшай школы ў Францыі (1994г.), у Германіі (1995,1996гг.), Кітаі, Расіі. Ён аўтар 64 навуковых і метадычных работ, у тым ліку манаграфіі "Максімальныя падгрупы ў тэорыі класаў канечных груп".

М.В.Селькін неаднаразова заахвочваўся Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь, узнагароджаны знакам "Выдатнік адукацыі Рэспублікі Беларусь", у 1997г. яму прысвоена ганаровае званне "Заслужаны работнік адукацыі Рэспублікі Беларусь". Член-карэспандэнт Беларускай акадэміі адукацыі.

**Хроніка**

## НОВЫЯ ПРАРЭКТАРЫ

Загадам па універсітэту ад 20 сакавіка г.г. на пасаду першага прарэктара ГДУ пераведзены **КАРМАЗІН** Аляксандр Пятровіч, кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт, які працаваў прарэктарам па кадрах і сацыяльна-бытавых пытаннях.

Прарэктарам па вучэбнай рабоце стаў былы дэкан факультэта псіхалогіі і падрыхтоўкі да паступлення ў вну **КАМОРНІКАЎ** Сяргей Фёдаравіч, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар кафедры алгебры і геаметрыі.

**Канферэнцыі**

## АБМЯРКОЎВАЛА ЗДОЛЬНАЯ МОЛАДЗЬ

На матэматычным факультэце на працягу трох дзён працавала традыцыйная рэспубліканская навуковая канферэнцыя студэнтаў і аспірантаў "Новыя матэматычныя метады і камп'ютэрныя тэхналогіі ў праектаванні, вытворчасці і навуковых даследаваннях". Яе арганізатарамі былі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь разам з нашым універсітэтам. Праходзіла яна ўжо ў трэці раз.

У ГДУ прыехала здольная навуковая моладзь практычна з усіх буйных вну Беларусі, у тым ліку Беларускай дзяржаўнай політэхнічнай акадэміі, Беларускага дзяржаўнага універсітэта інфарматыкі і радыёэлектронікі, Беларускага тэхналагічнага універсітэта, Гродзенскага і Віцебскага дзяржуніверсітэтаў, Магілёўскага тэхналагічнага інстытута, Мазырскага педінстытута і інш.

На канферэнцыю было заяўлена 160 навуковых дакладаў, прачытана ў час работы чатырох яе секцый — 70. Абмеркаваны здабыткі студэнтаў і аспірантаў у навуковых даследаваннях па акрэсленай тэме канферэнцыі. Плануецца выпуск яе матэрыялаў асобным выданнем.

**А.КАМОРНІКАЎ, дацэнт кафедры ВМ і праграміравання, член аргкамітэта канферэнцыі.**

**1-га красавіка — Дзень геолага**

## ПЕРШААДКРЫВАЛЬНІКІ

У тым, што геолагаў многія ўяўляюць нястомнымі вандроўнікамі, якія праводзяць значную частку свайго жыцця ў экспедыцыях у цяжкадаступных неабжытых раёнах, ёсць немалая доля ісціны. Бясспрэчна, прафесія геолага рамантычная. Аднак за яе знешнім рамантызмам стаіць вялікая праца – штодзённая і карпатлівая. Геолагі вывучаюць зямныя нетры і робяць адкрыцці не толькі "у полі", г.зн. у экспедыцыях, але і ў час работы ў гарадах і пасёлках, у камеральных умовах, калі старанна апрацоўваюцца палявыя матэрыялы, дадзеныя пошукава-разведачных геафізічных і горна-буравых работ, аэрафотаздымкі і здымкі з космасу. Спецыялісты па крупінках вышукваюць факты аб наяўнасці ў пэўным раёне тых ці іншых карысных выкапняў, а таксама прыкметы, якія вызначаюць напрамкі далейшых пошукаў і разведкі.

Больш 80% мінеральных рэсурсаў здабываюцца з зямных нетраў. Дабрабыт грамадства, узровень развіцця тэхнікі ва ўсе часы залежалі ад забяспечанасці неабходнай мінеральнай сыравінай. Таму геалогію называюць фундаментам індустрыі. Там, дзе прайшлі разведчыкі нетраў, ствараюцца новыя эканамічныя раёны, буйныя тэрытарыяльна-вытворчыя комплексы, будуюцца новыя гарады.

На тэрыторыі Беларусі геолагамі разведана каля 4000 месцанараджэнняў розных карысных выкапняў. Адны з іх выкарыстоўваюцца ў народнай гаспадарцы (падземныя воды, будаўнічыя матэрыялы, торф, каменныя солі, цэментная сыравіна, даламіты). Іншыя – чакаюць свайго часу (буры вугаль, гаручыя сланцы, фасфаніты і інш.).

У новых эканамічных умовах Рэспублікі Беларусь у сувязі з разрывам народнагаспадарчых сувязей паміж рэгіёнамі былога СССР перад геолагамі пастаўлены новыя задачы. Напрыклад, падрыхтоўка да прамысловай распрацоўкі Аколаўскага месцанараджэння жалезістых кварцытаў у Мінскай вобласці з мэтай стварэння жалезаруднай базы для БМЗ у г.Жлобіне. Вядуцца комплексныя геолагапошукавыя

**(Заканчэнне на 2-й стар)**

1-га красавіка — Дзень геолага

# ПЕРШААДКРЫВАЛЬНІКІ

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

работы па вырашэнню алмазнай праблемы, таму што алмазы для апрацоўкі дастаўляюцца на гомельскі завод "Крышталь" з далёкай Якуціі.

У шматтысячным калектыве беларускіх геолагаў, а таксама за межамі рэспублікі, працуюць і выпускнікі геалагічнага (цяпер геолага-геаграфічнага) факультэта нашага універсітэта. Ён перасягнуў 30-гадовы рубеж сваёй дзейнасці, выпусціў за гэты час 1678 высокакваліфікаваных спецыялістаў і зараз працягвае рыхтаваць маладое пакаленне геолагаў.

**1-га красавіка мы па традыцыі адзначым прафесійнае свята – Дзень геолага. З пачуццём глыбокай павагі і прызнання перш за ўсё віншуем ветэранаў геалагічнай галіны і ветэранаў факультэта прафесараў В.А.Вахрушава і А.П.Пінчука, дацэнтаў А.А.Недавізіна, Л.Д.Мядзведзева, А.П.Паўлаву, Ю.П.Іванова і ўсіх астатніх выкладчыкаў і супрацоўнікаў геафака. Жадаем ім добрага здароўя і поспехаў у выхаванні дастойнай, высокаадукаванай змены ветэранам-геолагам. А студэнтам – паспяховага авалодвання ведамі, настойлівасці і працалюбства на шляху да звання геолага.**

**А.ІЛЫНЧЫК,**
**ст.выкладчык кафедры геалогіі і разведкі карысных выкапняў.**



Будучыя геолагі перад адпраўкай на практыку.
Фота У.Чысціка.

## ПАРАДАК І ДЫСЦЫПЛІНА – НА ПЕРШЫМ ПЛАНЕ

Адбылося пашыранае пасяджэнне прафсаюзнага камітэта універсітэта, у якім прыняў удзел новы рэктар прафесар М.В.Селькін. Па інфармацыях старшыні камісіі грамадскага кантролю за захаваннем заканадаўства аб працы А.Р.Рыбальчанкі і начальніка вучэбнага аддзела Н.І.Папковай абмеркавана пытанне аб стане працоўнай і выканальніцкай дысцыпліны ў калектыве ГДУ.

Папярэдне праведзеная членамі прафкома праверка прыходу на працу работнікаў факультэтаў і структурных падраздзяленняў, пачатку вучэбных заняткаў выявіла нямала парушэнняў: многія супрацоўнікі спазніліся на працу, былі затрымкі з пачаткам заняткаў і нават іх зрывы на фізічным факультэце, факультэце замежных моў і інш. Вінаватыя будуць пазбаўляцца грашовых надбавак, прэміяльных выплат.

М.В.Селькін, які выступіў на пасяджэнні, падкрэсліў думку аб тым, што дысцыпліна і парадак у ГДУ павінны стаяць на першым месцы як умова паспяховай работы калектыву універсітэта ва ўсіх сферах дзейнасці.

У выступленні старшыні камісіі па ахове працы і ТБ А.М.Семянкова былі асветлены пытанні забеспячэння работнікаў, якія працуюць у шкодных умовах, прыбіральшчыц мыючымі, чысцячымі сродкамі, іншымі неабходнымі матэрыяламі. Нормы іх водпуску на сённяшні дзень вельмі недастатковыя для нармальнай работы, таму пастаўлена задача адшукаць матэрыяльныя сродкі на іх павелічэнне. Названы таксама недахопы, выяўленыя камісіяй па ахове працы і ТБ у час праверкі санітарнага стану, правілаў супрацьпажарнай бяспекі і ТБ на факультэтах і ў падраздзяленнях. Не ўсюды вядзецца неабходная дакументацыя, ігнаруюцца правілы тэхнікі бяспекі, не хапае вогнетушыцеляў, пажарных рукавоў, не ўкамплектаваны, або зусім адсутнічаюць медыцынскія аптэчкі. Звернута ўвага на недастатковую работу ў гэтым плане універсітэцкай службы па ТБ.

Падкрэслівалася, што належныя парадак, чысціня ва універсітэцкіх карпусах, інтэрнатах, у месцах агульнага карыстання залежаць не толькі ад добрасумленнай працы прыбіральшчыц, але і ад культуры паводзін кожнага з нас — студэнтаў, супрацоўнікаў, выкладчыкаў.

Цікавае -- у вучэбным працэсе

## НАМ АДКРЫЎСЯ ЧАРОЎНЫ СВЕТ

На працягу вось ужо некалькіх гадоў кафедра ўсходнеславянскіх народаў гістарычнага факультэта выкладае для студэнтаў III-IV курсаў цікавы спецкурс "Гісторыя музычнай культуры навейшага часу". Вядзе заняткі па ім кандыдат гістарычных навук і, як аказалася, вельмі добры знаўца музыкі Уладзімір Іванавіч Бышык.

На занятках, якія праходзяць нетрадыцыйна, з праслухоўваннем розных музычных запісаў, студэнты вучацца разумець чароўны свет гэтага віду мастацтва, знаёмяцца з творамі рускіх і замежных класікаў. Часта гучыць музыка і ў жывым выкананні: самі студэнты могуць сыграць пэўныя музычныя творы на гітары ці гармоніку, іншых інструментах. Як адзначае трэцякурснік Ігар Гаўрыленка, "У.І.Бышык — Калумб, які адкрыў для нас новы свет — свет класічнай музыкі!" Гэта выказванне поўнасцю падтрымліваюць усе студэнты, якія вывучаюць названы спецкурс.

Дагэтуль мала хто ведаў, што Уладзімір Іванавіч з'яўляецца таленавітым музыкантам-аматарам, які цудоўна іграе на гармоніку і гітары. І калі вам давядзецца пачуць чароўныя гукі музыкі ў вучэбным корпусе №2, значыць, ідуць чарговыя заняткі пад кіраўніцтвам У.І.Бышыка.

**А.ПУСЕЎ, А.ПІШЧЫК, В.КРАЎЧАНКА,**
**студэнты III курса гістарычнага факультэта.**

# ПРАВИЛА ВНУТРЕННЕГО РАСПОРЯДКА ГОМЕЛЬСКОГО ГОСУДАРСТВЕННОГО

### I.ОБЩИЕ ПОЛОЖЕНИЯ

1. Студенческие общежития ГГУ им.Ф.Скорины предназначаются для проживания студентов, абитуриентов, аспирантов, слушателей подготовительного отделения и института повышения квалификации и переподготовки кадров дневной формы обучения.

Во время зимних и летних каникул, при наличии свободных мест, администрация университета решает вопрос о заселении студентов заочной формы обучения на период сдачи экзаменационной сессии.

2. Вселение нуждающихся в общежитие осуществляется на основании договора найма жилой площади, заключенного между администрацией университета и вселяемым в общежитие, и приказа ректора.

Места в общежитии для абитуриентов предоставляются на период сдачи вступительных экзаменов на основании списков, утвержденных администрацией университета.

3. Лицо, вселяемое в общежитие, должно лично предъявить договор о найме жилой площади, паспорт с пометкой о выписке с последнего места жительства, медсправку о состоянии здоровья, 3 фотографии размером 3х4.

4. Вселяемые в общежитие должны пройти инструктаж по технике безопасности при эксплуатации электробытового и газового оборудования, изучить Правила внутреннего распорядка и ознакомиться с Положением об общежитии.

5. Переселение жильцов из одного общежития в другое, из одной комнаты в другую производится отделом воспитательной работы по согласованию с администрацией общежития на основании заявления студента и приказа ректора.

6. При отчислении студента из университета, после окончания учебы или лишении места в общежитии за систематическое нарушение Правил внутреннего распорядка студент освобождает и сдает администрации общежития жилую площадь в надлежащем состоянии, ключи от жилых помещений, санитарно-техническое и иное оборудование по акту в трехдневный срок со дня прекращения действия или расторжения договора на основании приказа ректора.

Абитуриенты, которые получили неудовлетворительные оценки на экзаменах, и те из них, кто подал апелляцию, освобождают места в общежитии в течение двух дней со дня объявления результатов экзаменов или после рассмотрения апелляции.

7. Порядок пользования общежитием студентами и другими жильцами во время каникул определяется администрацией университета по согласованию с органами самоуправления общежития и профсоюзным комитетом.

8. Студентам, аспирантам и слушателям подготовительного отделения на время проживания на каждый учебный год выдается по описи необходимое имущество и инвентарь под личную ответственность.

9. Администрация общежития выдает проживающим пропуска установленного образца, которые обязательно предъявляются при входе дежурному по общежитию.

Передача пропусков другим лицам категорически запрещена. В случае передачи пропусков студенты, аспиранты и слушатели подготовительного отделения подлежат выселению из общежития, а в особых случаях — отчислению из университета. При выбытии из общежития пропуск сдается заведующему общежитием.

### II.ОРГАНИЗАЦИЯ ПРОПУСКНОГО РЕЖИМА В СТУДЕНЧЕСКИХ ОБЩЕЖИТИЯХ ГГУ

1. Проживающие проходят в общежитие по пропускам установленной формы, преподаватели и сотрудники — по удостоверениям личности.

Вход в общежитие для проживающих в нем прекращается в $23^{00}$.

2. При входе в общежитие пропуск предъявляется в развернутом виде.

3. Вход в общежитие посторонних лиц разрешается по предъявлению паспорта или удостоверения личности с обязательным вызовом посещаемого студента и оставлением документов у дежурного по общежитию с обязательной регистрацией в книге посетителей: фамилия, инициалы, сведения о прописке или месте работы (учебы, службы и т.п.), к кому и в какую комнату проходит, время прихода и ухода, роспись посетителя при уходе о получении документа.

Студент лично встречает посетителя, оставляет встречный документ и несет полную ответственность за поведение гостя, его своевременный уход из общежития.

Дежурный по общежитию несет персональную ответственность за сохранность документов.

4. Вход в общежитие посторонним лицам разрешен с $12^{00}$ до $22^{30}$; в $23^{00}$ посетители обязаны покинуть общежитие.

5. Посещение общежития не разрешается лицам с просроченным паспортом, недействительными документами, в состоянии алкогольного и наркотического опьянения, а также лицам, ранее замеченным в нарушении Правил внутреннего распорядка в общежитии.

6. На время карантина в связи с массовыми инфекционными заболеваниями администрация общежития имеет право временно запретить вход посторонних лиц .

Персональную ответственность за состояние пропускного режима несет заведующий общежитием.

### III.ПОРЯДОК ДЕЖУРСТВА СТУДЕНТОВ НА ВАХТЕ ПРИ ПОСЕЩЕНИИ ОБЩЕЖИТИЙ ГГУ

1. С целью усиления пропускного режима и поддержания порядка в общежитиях при посещении студентов, аспирантов и слушателей подготовительного отделения посетителями организуется дежурство из числа проживающих там студентов.

2. Дежурные по общежитию непосредственно подчиняются председателю студсовета, зав. общежитием, воспитателю общежития и дежурному по общежитию (вахтеру).

3. Зав. общежитием или воспитателем накануне дежурства проводится инструктаж дежурных студентов и дежурного по общежитию (вахтера), на котором доводятся под роспись их обязанности, особенности дежурства, о чем делается соответствующая запись в книге инструктажа.

4. График дежурства составляется студсоветом по согласованию с воспитателем и утверждается зав.общежитием, доводится до студентов под роспись старостой дежурного этажа.

Время дежурства:
с $12^{00}$ до $17^{30}$ — 1 смена;
с $17^{30}$ до $23^{00}$ — 2 смена.

Контроль за точное выполнение порядка приема посетителей осуществляет дежурный по общежитию (вахтер).

5. Персональную ответственность за своевременное заступление и качество дежурства студентов несет председатель студсовета.

6. Воспитатель общежития совместно с председателем студсовета периодически проверяют работу по пропускному режиму, заслушивают студентов, не выполняющих свои обязанности, проводят индивидуальную работу с этой категорией студентов, принимают к ним меры общественного воздействия, при необходимости дают рекомендации о привлечении этих студентов к административной ответственности, информируют начальника отдела воспитательной работы о состоянии пропускного режима в общежитии.

Сотрудники и преподаватели, причастные к воспитательному процессу, представители общественных организаций периодически осуществляют контроль за соблюдением пропускного режима, порядка и правил проживания в общежитии, делая соответствующие записи об обнаруженных недостатках в журнале посещения общежития.

7. **Функциональные обязанности дежурных студентов.**

На дежурство по общежитию заступают одновременно два студента. Обязанности первого из них сводятся непосредственно к приему посетителей, проверке документов, инструктированию о времени и правилах посещения, ведению журнала посетителей.

В обязанности второго дежурного входит вызов студентов, к которым прибыл посетитель.

Дежурным студентам запрещается отлучаться с дежурства без разрешения дежурного по общежитию (вахтера).

8.Ответственность за невыход на дежурство или неудовлетворительное его несение несет председатель студсовета.

При невыходе на дежурство студентов согласно графика по каким-либо причинам посещение посетителей временно не проводится. Студсоветом совместно с администрацией общежития назначаются следующие по графику студенты. Невыход на дежурство или опоздание квалифицируется как грубое нарушение правил проживания в общежитии. Председателем студсовета проводится проверка по данному факту. В случае невыхода на дежурство без уважительной причины к виновным применяются дисциплинарные взыскания.

### IV. ПОРЯДОК ДЕЖУРСТВА СТУДЕНТОВ НА ЭТАЖЕ

1. С целью соблюдения Правил внутреннего распорядка и улучшения быта студентов, поддержания чистоты и порядка в общежитии организуется дежурство студентов на этажах.

2. Дежурные по этажу подчиняются старосте этажа, председателю студсовета, его заместителю, заведующей и воспитателю общежития.

**Аб творчасці нашых выпускнікоў**

# ПЕРАЕМНАСЦЬ ТРАДЫЦЫЙ

**(Заканчэнне. Пачатак у №4).**

Наступны раздзел "І словы мае — вярыгі мае..." прысвечаны паэтам, чые ўваходзіны ў літаратуру прыпалі на 80-90-я гады. Адкрываецца ён артыкуламі той жа Наталлі Гаруновай, дзе разглядаецца творчасць Анатоля Сыса і Эдуарда Акуліна. Іван Штэйнер, асвятляючы гісторыю гомельскай універсітэцкай школы (анталогія "Крыніцы"), пісаў: "Іменна нашы выпускнікі былі сярод заснавальнікаў таварыства маладых літаратараў "Тутэйшыя", якое кінула выклік традыцыям застою, заспакаення, халтуры ў літаратуры... І гэта была не проста чарговая змена пакаленняў, не чарговае рушэнне аўтарытэтаў, бяздумная барацьба па тыпу — "у рожкі са старымі". Маладыя неслі сапраўды новае — і светабачанне, і светаўспрыняцце, і яго ўвасабленне".

Наталля Гарунова не хавае свайго захаплення творчасцю Анатоля Сыса (артыкул "Я аддаў сябе агню..."): "Ён — ужо імя, ужо з'ява", "А.Сыс з шэрагу тых паэтаў, творчасць якіх варта разглядаць не як "яшчэ", а як "ужо", "адзін з лепшых паэтаў сучаснай Беларусі", "непрадказальная, яркая індывідуальнасць". Леанід Галубовіч у артыкуле "Рытуал постмадэрніста" (ЛіМ, 7 студзеня 2000 г.) выказаўся: "А хто можа прыпомніць сур'ёзны й крытычны разгляд творчасці тых жа Анатоля Сыса і Славаміра Адамовіча?!" Канешне, Наталлі Гаруновай яшчэ расці дый расці як крытыку, але нельга не адзначыць яе назіральнасць і ўдумлівасць. Цікавай падаецца і заўвага маладой даследчыцы адносна экспрэсіяністычнай афарбоўкі многіх вершаў паэта. І, магчыма, варта прыслухацца да словаў Наталлі Гаруновай: "Добраахвотна аддаючы сябе агню паэзіі, творца нібы спальвае сябе, за што ніхто не можа і не павінен яго асуджаць".

Эдуарда Акуліна Наталля Гарунова называе "вытанчаным, разважлівым і назіральным паэтам-самародкам" (артыкул "Мая Крывія..."). Засяроджваючыся на аналізе пейзажнай лірыкі Акуліна, малады крытык гаворыць аб імпрэсіяністычных рысах яго паэзіі: "Падобна М.Багдановічу, Зм.Бядулю, Э.Акулін перадае свае ўражанні, пачуцці, спалучаючы ў адзінае цэлае паэзію, жывапіс і музыку".

Яшчэ адзін артыкул Юліі Сальнікавай "...Раз назваў ты сябе Паэтам" прысвечаны творчасці самабытнай паэтэсы Ларысы Раманавай, лірыка якой, па трапным вызначэнні даследчыцы, "камерная, не разлічаная на разуменне і адэкватнае ўспрыняцце шырокім колам чытачоў". Ларыса Раманава, бясспрэчна, адметная творчая індывідуальнасць. Яе першы зборнік "Аддай асалоду Богу" — таму сведчанне. Лірыка Раманавай не простая як для ўспрымання, так і для аналізу. Агляд творчасці паэтэсы, дадзены Сальнікавай, можа быць пакладзены ў падмурак вывучэння паэзіі Раманавай. Так, даследчыца зазначае: "Філасофскі падтэкст лірыкі Л.Раманавай жывіцца з крыніцы экзістэнцыялізму, яго ідэяй самакаштоўнасці чалавечага існавання". І далей: "Паэтку нельга назваць пясняркай "неба" ці "зямлі", як, напрыклад, Купалу ці Коласа: у яе вершах адмаўляецца ўсялякая магчымасць цвёрдай прымацаванасці да чаго-небудзь".

Аўтар зборніка — Наталля Дзенісюк — пачынае разгляд творчасці Вольгі Куртаніч ("Паэзія Вольгі Куртаніч") з разважанняў адносна так званай жаночай літаратуры і яе быццам бы няздольнасці да глыбокіх філасофскіх абагульненняў. Абвяргаючы гэты стэрэатып, маладая даследчыца сцвярджае, што вершы В.Куртаніч — "экзістэнцыя чалавечага быцця, пошук самога сябе". Трэба сказаць, што сама Наталля Дзенісюк таксама спрабуе сябе ў творчасці, нізка яе вершаў друкавалася ва ўжо згаданым зборніку "Крыніцы", часопісе "Першацвет". Таму паэзію, тым больш "жаночую", яна адчувае як бы "знутры". Гэта надае асаблівую цікавасць яе разважанням. Так, Дзенісюк адзначае, што "В.Куртаніч уласціва трагічнае ўспрыманне свету, пачуццё безвыходнасці, адчуванне нейкае фатальнае згубнасці, прадчуванне духоўнае і фізічнае смерці ўсяго чалавецтва. Рэальны свет, на яе думку, супярэчлівы, варожы, змрочны, пазбаўлены гармоніі, спакою, цеплыні".

Алена Мядзведзева ў артыкуле "У хаце той мая каханая жыве...", прысвечаным творчасці Андрэя Мельнікава, разважае над такой з'явай, як беларускі бардаўскі рух. Маладая даследчыца робіць выснову, што рамкі жанра "ніколі не былі вельмі жорсткімі". Гэта "...давала і дае магчымасць праявіць і выказаць сябе, што і прыцягвае ў беларускім бардаўскім руху, у адрозненне ад таго ж расейскага, дзе рамкі жанра даволі жорстка акрэсленыя, а гэта цягне за сабой пэўныя абмежаванні творчай індывідуальнасці і свабоды выяўлення". Мядзведзева вылучае ў творчасці Андрэя Мельнікава найперш яскрава акрэсленую грамадзянскую пазіцыю, і з гэтым меркаваннем цяжка не пагадзіцца: "праз сваю творчасць Андрэй не толькі выяўляе яркую індывідуальнасць, а актыўна сцвярджае сваю грамадскую жыццёвую пазіцыю, што патрабуе пэўнай смеласці і адказнасці...", "увогуле, калі падбіраць словы, якімі можна было б ахарактарызаваць усю творчасць Андрэя Мельнікава, то, відавочна, імі былі б словы — глыбокая, да ўтрапёнасці, патрыятычнасць". Алена Мядзведзева робіць цікавую выснову, што "песімізм, пэўна, можна лічыць асаблівасцю творчай манеры Андрэя Мельнікава". Цікава, ці пагаджаецца сам Мельнікаў з такой высновай? Праўда, як працягвае далей Мядзедзева, "гэта песімізм, які мае вялікую моц ствральнага ўздзеяння, песімізм, які надае моцаў для змагання, для пераадольвання цяжкасцяў".

Філасофскай глыбінёй, даследчанасцю вылучаюцца разважанні Наталлі Лушчык адносна кнігі рускамоўнага аўтара Лявона Баранава "Проста голас" (артыкул "Люстэрка постмадэрна" (на рускай мове). Адзначаючы, што "кніга Л.Баранава "Проста голас" — гэта не проста галас, і нават зусім не голас, а наадварот —шматгалоссе: тут і Р.-М.Рыльке і Т.С.Эліот, М.Хайдэгер і К.Ясперс і Г.Памеранц...", Лушчык называе і "спецыфічны набор выяўленчых сродкаў, што выкарыстоўвае Л.Баранаў: тут і элементы плыні свядомасці, і асацыятыўны мантаж, і нейкі стылёвы сінкрэтызм, і гульня мовы ...". Наталля Лушчык у сваіх разважаннях апелюе да А.дэ Бенуа, О.Шпенглера, А. Бергсона, М.Хайдэгера, Т.С.Эліота, зазначае, што "Проста голас" — гэта кніга для пасвечаных, гэта запрашэнне да пазнавання, супастаўлення эстэтычных, філасофскіх палажэнняў, канцэпцый, універсалій, адлюстраваных у духоўным, інтэлектуальным, шырэй — асабістым — люстэрку "таленавітага" (па Бахціну) чытача, з гэтым жа шэрагам у трактоўцы аўтара".

Віктар Ярац у артыкуле "Адлегласць голаса — жыццё" (на рускай мове) гаворыць пра паэзію акадэміка Івана Фёдаравіча Харламава. Ён, хоць і не з'яўляецца прадстаўніком гомельскай універсітэцкай школы ў беларускай літаратуры, але, канешне ж, спрычыніўся да выхавання не адной творчай асобы, бо ўжо на працягу доўгага часу выкладае ў нашай ВНУ.

Віктар Фяськоў разглядае парадыйныя творы Анатоля Зэкава (артыкул "Паэзія навыварат"). Крытык не толькі аналізуе яго творчасць, але і разважае пра сутнасць пародыі як жанру. Фяськоў даволі дакладна вызначае адметнасць мастацкага почырку Зэкава: "Аўтар ставіць за мэту не проста паўтараць, узнаўляць манеру парадыруемых паэтаў. Ён быццам пераймае самую сутнасць іх мастацкага мыслення, прадставіўшы ў завостраным, парадыйным варыянце манеру іх паэтычнага стылю, своеасаблівасць паэтычнай інтанацыі".

У чацвёртым раздзеле — "Эпічнае спасціжэнне рэчаіснасці" — гаворка ідзе пра творчасць празаікаў. Хаця Юлія Сальнікава, як мы ўжо казалі, зусім нядаўна пачала выступаць у друку, яе артыкулы вылучаюцца прынцыповасцю і смеласцю выказванняў. Так, востра пачынае яна і свае разважанні над творамі І.Шамякіна (раздзел "Сіла родных каранёў"): "Зараз вакол імя Івана Шамякіна ідуць заўзятыя спрэчкі, ці варта яго спадчына на сучасным этапе тае пашаны, што мела ў так званыя "застойныя" гады, тым больш, што і сёння пісьменнік не змяніў сваіх поглядаў і застаецца верным традыцыям сацрэалізму". Разглядаючы дзённікі пісьменніка 1980-1995 гадоў, Сальнікава піша: "У іх творца выносіць на суд масавага чытача не толькі свае перамогі і дасягненні, але і выкрывае ўласныя памылкі і нават чалавечыя слабасці. Гэткая здзіўляючая шчырасць міжволі прымушае паважаць Шамякіна-чалавека, Шамякіна-літаратара, Шамякіна-асобу". У адпаведнасці з агульнай скіраванасцю зборніка "Душа прычаліцца крылом да неба..." малады крытык надае больш увагі тым дзённікавым запісам, што непасрэдна звязаны з Гомелем і нашым універсітэтам. Асабліва хочацца, услед за Сальнікавай, працытаваць тыя запісы І.Шамякіна, што тычацца былога рэктара універсітэта Барыса Васільевіча Бокуця, сусветна вядомага фізіка, які выдатна валодаў беларускай мовай і прыкладваў шмат намаганняў, каб "зрабіць Гомельскі універсітэт беларускім".

Аксана Пачкоўская разважае пра "Жыццёвы і творчы шлях Міхася Даніленкі", аўтара дванаццаці празаічных зборнікаў. Адзначаючы сціслась і лаканічнасць аўтарскага выказвання, прастату, немудрагелістасць сюжэтнай пабудовы, "зладжанасць кампазіцыі і назіральнасць, пранікнёнасць і прачуласць аповеду, надзённасць і жыццёвасць праблематыкі" твораў празаіка, Пачкоўская слушна заўважае: "Магчыма, М.Даніленка не прастаў якасна новае літаратурнае сцяжыны, не скідваў з п'едэсталаў літаратурныя догмы, не быў бунтаром і пракокам айчыннага прыгожага пісьменства. Але здаецца мне, што ніколі б не шуганула ўгару сюрмадэрновае полымя сучаснае беларускае літаратуры, калі б не было напачатку крэсіва і кнота рэалізму".

Прадуманасцю, "вынашанасцю", узважанасцю вылучаюцца роздумы Сяргея Ханені над творамі Анатоля Казлова: "...А.Казлова ніяк не назавеш, кажучы словамі В.Акудовіча, "нахлебнікам традыцыі". Разам з тым пісьменніку зусім не ўласцівы і т.зв. "абсалютны" авангард". Сяргей Ханеня адзначае філасофскую паглыбленасць твораў празаіка, "асобую філасофскую паэтычнасць", імкненне да "пастаноўкі нават у невялікіх па аб'ёме творах агульнапланетарных філасофскіх пытанняў": "асоба ў мастацкім свеце А.Казлова набывае сапраўды касмічны маштаб, бо асэнсоўваецца пісьменнікам у сусветным кантэксце". Паэтычнасць прозы А.Казлова даследчык выводзіць са стылю "новай рэчыўнасці", што "асацыіруецца з імем славутага аўстрыйца Р.М.Рыльке", а светаадчуванне пісьменніка вызначае як трагічнае. Разглядаючы апавяданне "Матрац", якое, на думку С.Ханені, "валодае якасцямі літаратурнага аўтарскага маніфесту", даследчык вызначае адметнасць усёй прозы А.Казлова: "імкненне да новага, неархаічнага мастацкага абагульнення рэчаіснасці, новых узаемаадносінаў мастацкай думкі з жыццёвым матэрыялам, новай дыялектыкі вобраза і праблемы".

Укладальнік зборніка Іван Штэйнер у заключным артыкуле "А што там далей?" спрабуе "прадвызначыць контуры будучай эвалюцыі гомельскай школы ў прыгожым мастацтве", гаворыць пра планы кафедры па вывучэнню творчасці сваіх таленавітых выпускнікоў, не толькі пісьменнікаў, але і даследчыкаў літаратуры, фалькларыстаў, знаёміць з маладымі паэткамі Наталляй Дзенісюк і Аленай Мядзведзевай. Будзем спадзявацца, што хутка іх імёны стануць вядомымі шырокай чытацкай публіцы.

**Алеся ВЯЛЕСЬКА.**

**О здоровье — и не только о нем**

# ТАМ, ГДЕ ЗВЕЗДНОЕ НЕБО...

После очередной экзаменационной сессии студенты жаждут восстановить свою пошатнувшуюся нервную систему. Каждый это делает по-разному. Кто-то предпочитает завалиться на диван перед телевизором и отоспаться, а самые "изобретательные" взяли в профкоме путевки в различные санатории, дома отдыха, и, в частности, в пансионат "Золотые пески". О способах укрепить свое здоровье именно в нем и пойдет речь.

Людям, желающим тишины и спокойствия, получить лечение, там очень понравится. Санаторий находится в стороне от трассы, в лесу. Очень чистый воздух, тишина... А какое звездное небо в ясные ночи! Столько звезд в городе вовек не увидишь. Такое ощущение, будто находишься не в Беларуси, а где-нибудь в Альпах. Особенно благоприятствуют этому впечатлению постройки санатория, напоминающие по стилю швейцарское шале. Что же касается лечения, то оно в пансионате, без сомнения, на высшем уровне. По-моему, там есть все процедуры, которые только можно пожелать: селенотерапия; ванны – жемчужные, вихревые, контрастные; душ — Шарко, циркулярный; сауна, бассейн и т.д.

Кроме всего прочего (что меня, честно говоря, удивило), там просто потрясающе готовят!

День проходит быстро – процедуры, послеобеденный отдых, а после ужина – дискотека с $21^{30}$ да $23^{00}$. Ну разве студенту этого времени хватит, чтобы хоть более-менее расслабиться? Вот так и получается, что после окончания так называемой "официальной" дискотеки начинается "неофициальная" – обычно за стеной или наверху у соседей.

В свете всего этого неудивительно, что администрация, очевидно, наученная горьким опытом, старается отселить приезжающих студентов как можно дальше от обычных отдыхающих – большей частью в коттеджи. К слову сказать, там очень даже ничего: мебель практически новая, по большей части не поломанная; санузел чистый и не расколотый; зеркала целые, и в них можно даже увидеть себя практически не искаженным. И даже (в коттедже для особо привилегированных персон) есть работающие (!) цветной телевизор и холодильник.

В общем, что ни говори, а чувствуется, что "Золотые пески" — бывшая здравница общесоюзного значения. И даже сейчас, на фоне всеобщего кризиса, держит марку одного из лучших санаториев: расположенный в чудесном месте, он сохранил высочайшее качество оздоровления и обслуживания.

**Ольга ПЕТРУШЕНКО,**
**студентка III курса**
**юридического факультета.**

**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ ІМЯ Ф.СКАРЫНЫ**

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:

— беларускай літаратуры — ст.выкладчыка;
— эканомікі і кіравання вытворчасцю — дацэнта;
— бухуліку, кантролю і АГД — ст.выкладчыка (2);
— тэорыі і методыкі фізічнай культуры — ст.выкладчыка;
— нямецкай мовы — выкладчыка (4);
— тэорыі і гісторыі дзяржавы і права — асістэнта;
— тэорыі і практыкі англійскай мовы — выкладчыка (2);
— англійскай мовы — выкладчыка;
— алгебры і геаметрыі — асістэнта;
-- фізвыхавання і спорту — выкладчыка;
— аздараўленчай і лячэбнай фізкультуры — дацэнта.

**Тэрмін падачы заяў — не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.**

Заявы накіроўваць на адрас: 246699, г.Гомель, вул.Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытый публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

ЗАСНАВАЛЬНІК -- Гомельскі дзяржаўны універсітэт імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.
Зарэгістравана ў Дзяржкамдруку 26 чэрвеня 1996г. Рэгістрацыйны № 263

Спонсар газеты -- прафком студэнтаў.

Газета набрана и сверстана на настольно-издательском комплексе ИВЦ ГГУ, отпечатана на фабрике "Полеспечать", г.Гомель, ул. Советская, 1.

Якасць друку адпавядае якасці арыгіналаў заказчыка.

Рэдактар
**Уладзімір БАЛОГА**

Аб'ём 1 друк. арк.
Тыраж 1.000 экз.
Заказ 164.
Падпісана да друку 24.03.2000 г.